Цэна асобнага нумеру 5 кап.

# НАША НІВА

**Выходзіць што тыдзень.**

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: **Вільня, Завальная вуліца, д. № 7.**

Цэна з перэсылкай і дастаўкай на 1 г. — 2 р. 50 к., на 6 мес. — 1 р. 25 к., на 3 м. — 65 к., на 1 мес. — 25 к. За граніцай: на 1 г. — 4 р., на 6 мес. — 2 р. 3 мес. — 1 р. Перамена адрэсу — 20 коп.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі. Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ надпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто не захочэ, каб была надрукавана праўдзівая фамілія Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рукапісы аўторам не вертаюцпа назад.

Год VII. 2 (15) лістапада 1912 г. №. 43 і 44.

## Ад Рэдакціі.

С прычыны пераходу ў новую друкарню „Наша Ніва“ ў тым тыдні не магла выйсці.

*Вільня, 2 лістапада.*

**Селяне беларусы і выбары у Думу.**

Нявесёлые выбары, без надзеі на будучыну; выбары адбываліся, як кажуць, «у цёмную», бо каб выбіраць у Думу трэба было абгаварыць што зроблена і чаго нязроблена у Трэцьцяй Думе; якіе партіі вінаваты, што ўсё жыцьцё неяк загніваецца, стаіць на мейсцы; жывём, як у доме з замураванымі вокнамі: бяз сьвету, бяз вольнаго наветра.

Для разумных і правільных выбароў трэба селянам цікавіцца і разумець палітыку, трэба чытаць газеты, на сабраньнях абсуджаць свае патрэбы і якіе партіі могуць іх здаволіць, хочуць служыць народу, а не панаваць над ім, як над стадам, цемната каторага ім пад руку.

Мы апісывалі для прыкладу выбары у Вілейцы і у Вільні. Чацьвёртая часьць мужыкоў была чытаючая газеты, мела у галаве ясные думкі аб Думе; чацьвёртая часьць было ня толкі цёмных, а ім хацелася толькі аднаго, каб іх выбралі,—а іх не выбіралі, дык яны сумысьля разбівалі саглас грамадзянства і усім клалі «на лева»; вінаваціць у гэтым трэба воласьці, каторые выбралі не сумленных людзей, думаючых толькі аб сваей асобе; трэцьця чэцьверць гэта былі людзі цёмные у палітыцы, але яны трымаліся хоць цьвёрда правай стараны, бо яны паверылі, скажэм, угаворам своіх знаёмых сьвяшчэнікоў, што Зэмыслоўскі і саюзнікі, гэта карысные для Расеі людзі; гэтых селян можна ешчэ шанаваць, бо яны прынялі палітычную праграму „правых“, дзеля таго што не адлічаюць у палітыцы, хто іх ворагі, а хто прыяцелі. Астатняя чэцьверць былі людзі, которые за пачастунак добры хіліліся да таго, хто ім фундуець і салодка гаворыць.

Прыезжаючы у губэрню, нашы беларусы саўсім ужо нічога ня могуць зразумець, ні маючы свайго камандзэра; іх цягаюць у колькі бакоў: адны частуюць, другіе угаварываюць, а мужыкам, як раз трэба не разлетацца на усе староны, а, разам сабраўшыся, цьвёрда пастанавіць каго выбраць і з кім злучацца,—тагды яны не былі бы толькі «выбарным мясам».

Ешчэ трэба, каб, пачынаючы ад выбароў у воласці, сход даваў сваім выбарным наказ, якой партіі трымацца, не разбіваць сагласу у паветовым сабраньні і прылучацца да рэшэньня бальшынства; апрыч таго кожны павінен даваць адчот сходу. У павет мужыкі павінны прыежджаць за 2 дні, каб пазнаёміцца паміж сабой, угаварыцца аб палітычнай праграме, выбраць кандыдатоў. Цяпер было так, што сабраўшыся самі ня ведаюць, каго тут выбраць. Так што выбары саўсім ня выбары, а страта часу; часамі з бяды мужыкі кідаюць жрэбій, бо ніяк ня могуць выйсці с цяжкаго палажэньня. Па закону можна рабіць прэдвыборные сабраньня, бо інакш і выбары не маюць сэнсу, бо трэба сказаць, што мазгі у беларуса ёсьць і за пяць гадоў ужо мужыкі у палітыцы многа і многа паразумнелі. Выбары мужыкам не удаліся, але прычына гэтаго—не цемната народу; конь ня можэ у 1 гадзіну прабегчы 100 вёрст, але у 24 гадзіны можэ. Земляроб, каторы паволі круціць мазгамі, але моцна, ня можэ у 1 гадзіну зрабіць тое, на што треба 2 сутак работы.

## Дауней і цяпер.

Ешчэ зусім нідаўна выбралі мы дэпутатоў у Першую Думу. Тады было сьвята народнае... На выбары глядзелі, як на адну з важнейшых грамадзкіх павіннасьцей. «Выбіраймо найлепшых людзей!»—вось які окліч раздаваўся падчас выбароў. І запраўды, ў Першай Думе былі найлепшые сыны ўсяго краю—як кажуць, соль зямлі. Дума тады была надзеяй для ўсіх, што чэкалі новых парадкоў.

Прайшло шэсьць год. Цяпер ізноў былі мы сьведкамі выбароў у Чацьвёртую Думу. Якая вялікая перамена! «Апека» сваё зрабіла. Вера ў Думу згінула... Ідэйные момэнты падчас выбароў нейдзе расплыліся.. Шмат людзей зусім не цікавіліся выбарамі. Дзеля таго ня дзіва, што шмат дзе зусім не маглі адбыцца з'езды дробных землеўладзельцоў: ніхто не прыехаў...

Але найгорш тая «апека» адбілася на вёсцы. Усё сьветлае, лепшае абкідана балотам. Тое, што раней было сьвятым, цяпер не мае ніякай вагі. Запанаваў здзек самога народу, страшэнны здзек над народным прэдстаўніцтвам, што мае—павэдлуг маніфэсту 17 кастрычніка—вясьці гасударства па новай, вольнай дарозі!

Тая грамадзкая дэморалізація тым ешчэ страшнейшая, што яна ўсё болей пашыраецца і што пасьля трудна будзе ачысьціць душу народную. А што гэта праўда, відаць хаця-бы с таго, як селяне глядзелі на выбары. Яны, як пішэ Панкратов у «Русск. Сл.», глядзяць на Думу, як на нейкую казённую інстытуцію. Тая толькі разніца, што Дума ў Пецербурзі, а не ў Смаргонях, ці Чашніках... Карысьць з яе, што добра плацяць дэпутатам. І вось думка аб акуратных зарабатках у Думе была у селян палітычнай праграмай.

— Ты ўжо нажыўся,—нераз казалі даўнейшаму дэпутату,—дай зарабіць і другому!...

Рэдка калі былі чутны такіе галасы, што прыпаміналі выбары ў Першую Думу.

— Парупіся аб нас, аб нашай долі!

Так даўней казалі. А цяпер:

— Хочэш прайсьці у Думу? Пастаў вядро гарэлкі!

І гэтак запівалі цяпер выбар дэпутата, як даўней выбар пастуха, ці старасты.

У аднэй губэрніі чутны былі нават такіе гутаркі:

— Пашкадуйце мяне, беднаго. Памажыце свайму чэлавеку!—казаў кандыдат у дэпутаты.

— Пастаў, тады выбярэм!—крычалі селяне.

Кандыдат частаваў гарэлкай селян з свайго павету.

Кожнаму сьведомаму забаліць сэрцэ, калі прачытае гэтые гутаркі і даведаецца, як селяне прадавалі за гарэлку долю сваю...

Нехаця ціснецца пытаньне: Адкуль гэта узялося? Як гэта ўсё зрабілося?—На гэта той самы Панкратов дае добры атказ:

„Пачалося гэта с Трэйцяй Думы. Раней не было прыкметна. Трэйцяя Дума шмат дэкляравала, ды нічога не зрабіла. Ашукала. Сваей працай паказала, што нічым ня розніцца ад якой казённай канцэлярыі.

„Запраўды, добраго прэдстаўніка інтэрэсоў селян ня можна было пасланць. А трэба такі выбраць, І выбіраюць такога, каторы больш паставіць.

Такім парадкам глаўную роль у палітычным жыцьці селян пачынае мець... гарэлка. Вось да чаго мы дажылі..

і—м—і

## Проці украінцоў.

Нідаўно «День» надрукаваў цікавае апаведаньне: «Унутрэны славянін», у каторым апісываецца, як расейскіе патрыоты, прыняўшы нейкаго чэлавека за „славяніна“ с-пад аўстрыйцоў, пачалі суліць яму і волю, і новые лепшые парадкі,—адным словам, чуць ня неба. Але, як пасьля з гутаркі выйшла, што той „славянін“ толькі расеец, дык за свае скаргі папаў у вучастак. «Унутрэняго славяніна паймалі!».

За праўды-ж „патрыоты — націоналісты“ зусім не цікавяцца, ці усім каля іх добра жывецца. Яны толькі глядзяць за граніцы расейскаго гасударства. Калі тамака пабачаць нешта благое, зара на цэлы сьвет крычаць, што „над нашымі здзекуюцца!“ На кожным кроку паўтараецца, што саломінку ў чужым воку падгледзяць, а у сваім і бэлькі ня бачаць. А што тая бэлька ёсьць ды ешчэ надта вялікая, аб гэтым сьведчыць карэспандэнт «Р. Вѣд.“, каторы апісывае, як цяпер правые пайшлі вайной на братоў сваіх—на украінцоў.

У Чэрнігоўскай губэрніі, напрыклад, забаронена зьбіраць складчыны на памятнік Т. Шэвчэнка. У Кіеві наложэны печаці перш паліціей, а пасьля інспэкторам над друкарнямі і кнігарнямі на шафы с кніжкамі у мейсцовым украінскім клубе. У Каменец-Падольску адміністрація забараніла украінскай „Просвіце“ зрабіць дзьве вечарынкі і тэатр. У Полтаве паліцмэйстэр забараніў музыкально-драматычнаму кружку арганізаваць у Чыноўнічым садзе зусім нявінны „Украінскі кірмаш“, бо як кажэ, на ўселякі кірмаш, хаця-бы трываў два дні і прадаваліся на ім толькі пернікі, арэхі чы семячкі, патрэбна пазваленьне міністра ўнутрэных спраў... Украінскіе тэатры забаронены ў Жаботіне і Чыгірыне; падавалі прашэньне губэрнатору, але і той знайшоў, што так і трэба. Як прашкаджаюць шырыць украінскіе часопісі, можна судзіць хаця-бы с таго кавалка лісту, што быў надрукованы ў кіеўскай украінскай „Радзе“: «Дужа прашу паважаемую рэдакцію,—пішэ аўтор надрукаванаго лісту,—не высылаць мне больш сваю газэту. Беда! Сельскіе ўласьці, матавілоўскі старшына Аукеній Кулік, не аддаюць ні воднаго нумэру ужо другі месяц, не аддаюць і іншые украінскіе часопісі. Матавілоўскі староста ужо атрымаў адкуль-то загад зніштажыць усе, што прыходзяць, украінскіе газэты.... Будзьце ласкавы, пакідайце у сябе ўсе нумэры: калі колечы прыеду ў Кіеў і вазьму ўсе разам». Гэткіе лісты Рэдакція атрымывае бадай што дзень: тамака начальнік почты кідае мужыку ў твар пачтовы перавод, бо адрэсаваны на імя украінскай газэты; там ізноў прыстаў затрымывае земскаго пачтыльёна ды адбірае ад яго «Раду»; там здзекуюцца валасны старшына і пісар; а ў іншым ізноў мейсцы скінулі са службы народнаго вучыцеля ці пачтоваго чыноўніка за тое, што чыталі украінскіе кніжкі...

Так вядзецца на Украйне. У нас таксама нялепей. Нашы вучыцелі ешчэ добра памятаюць цыркуляры аб «Нашай Ніве». І ўсё-ж ткі *правые* маюць адвагу называць сябе «славянофіламі», значыцца, сябрамі славян. Але, ведама, яны такое-ж права маюць называць сябе „славянофіламі“, як і „патрыотамі“. І мы верым, што народ, калі дойдзе да яго слова праўды, адсунецца ад такіх людзей ды скажэ: „А скінь скурку, дабрадзею, бо зубкі відаць!“

І. М.

## Выбары у Гасуд. Думу.

**Усяго дагэтуль выбралі у Гас. Думу 438 дэпутатоў.**

Соціал-дэмократоў 13, трудавікоў 12, констытуціон. дэмократоў 61, прогрэсістоў (поступоўцоў) 33, палякоў 14, мусульманоў (татар) 5, акцябрыстоў 79, націоналістоў 74, правых 140, безпартійных 7.

Значыцца 138 прогрэсістоў і 214 правых.

## Выбары ад рускаго насяленьня Віленскай губэрніі.

18 акцябра з'ехалася 18 селян, 11 сьвяшчэнікоў, вучыцелей, чыноўнікоў і адзін адвакат, Поволоцкі (прогрэсіст ад Вільні). На зьездзі Святодухоўскаго брацтва ужо раней пастанавілі выбраць Замысловскаго (камандзера правых у Трэцьцяй Думе) і аднаго сьвяшчэніка. Усю выбарную кампанію вялі сьвяшчэнікі, пачынаючы ешчэ ад валасных выбароў; вось, свайго і дабіліся.

Селяне з'ехаліся за адзін дзень да выбароў. Іх заклікалі ў манастыр, дзе добра і смачна кармілі; іншых забраў к сабе сьвяшчэнік Левіцкі. Селяне замест таго, каб, сабраўшыся, добра разгаварыцца паміж сабой, каго выбраць, нічога гэтаго не рабілі; яны маглі бы злучыцца с 4 — 5 гарадзкімі выбаршыкамі, і тагды народная партія мела бы 22 галасы з 40 ды магла бы выбраць дэпутатоў сваіх, каторые палажілі бы ўсю душу і ўсе сілы на працу ў Думе дзеля карысьці Беларускаго

шы апраўдацца св. п. Я. К. паехаў назад у Харкоў, дзе паступіў у хірургічную клініку праф. Грубэ і там докторызаваўся. Пасьля ён перанёсся у Новочэркаск, дзе праз 30 гадоў дом яго быў прытулкам для ўсіх, хто прыежджаў з Беларусі. Сваім коштам вучыў ён 16 бедных, маладых людзей беларусоў, с каторых двое цяпер прафэсарамі унівэрсытэту, колькі лекарамі, адвакатамі і т. д,

Змучэны доўгай, няўпыннай працай св. п. Язэп Каралькевіч на 60 гаду свайго жыцьця пакінуў цяжкую лекарскую працу і задумаў у вясковай цішы правесьці свае апошніе гады. Хацеў ён купіць сабе кавалачак зямелькі у сваей дарагой бацькаўшчыне. але, як каталік, ня мог гэтаго зрабіць. З вялікім смуткам прышлося яму разстацца з гэтаю думкай і пераехаць у ваколіцы Варшавы, дзе і купіў ён сабе кавалак зямлі.

Тут у ціхай працы сярод простаго сермяжнаго народу насцігла яго сьмерць. Кончыў так ціха, як і жыў, з сумнай думкай, што ня у роднай зямліцы спачыне яго прах. Праз цэлае жіцьцё сваў, св. п. Я. Каралькевіч служыў толькі другім, найбольш бедным людзям-селянам і тавáрышам. Дарма лечыў, вучыў гаспадаркі, шырыў граматнасьць, знаёміў людзей з гігіенай, этыкай і т. д.; дзе мог і сколькі мог памагаў грашыма. Аб усіх думаў, апрача сябе. Хадзіў заўсёды бедна адзеты, часта атказываў сабе у самых патрэбнейшых рэчах думаючы, што другіе і таго не маюць. Хай-жэ беларусы згадаюць калі небудзь аднаго з лепшых, вя зубных братоў сваіх, аднаго с харашэйшых дзяцей зямлі Беларускай. Хай-жэ магіла яму лёгкай будзе.

В. Выслоух.

## З цыклю „Казкі Бацькаушчыны“

### Пад крыжам.

З балеснаю ў сэрцы пакорай
Пад крыжам з буцьвеўшым стаю,
І ўвокал—ад гораў да гораў
Зямлю агледаю сваю.

Навокала сьцеліцца столькі
Багацьця, красы і сьветла!
Хоць болькі, старые ўсё болькі,
Адна за аднэю легла.

Плакучые стогнуць бярозы,
Скідаючы лісьць залаты;
Хістаюцца дзікіе лозы,
Глухіе, сухіе кусты.

Звод нейкі гамоне, шапочэ:
— Калодаю, дружэ, ты будзь!
Душа толькі верыць ня хочэ,
Ня хочэ паняць і заснуць

Упаўшые грудзі калышэ
Жальбой непрыхільною сум,
І тысячы ў памяці пішэ
Гаротных, нявыжытых дум.

Бязсільна народ свой пытаю,
Абняўшы пахілены крыж:
— За што ты ад краю да краю
Магілай жывою ляжыш?

Ці коні твае патрупелі,
Цягаючы ў поце плугі?
Ці косы твае прытупелі
С крывавой на лузе смугі?..

Пытаю жывых назаліста,
Чэкаю, атказ ці бяжыць .
Маўчыць, як дамоўка. Ўсе чыста...
Пракляцьце і тое маўчыць.

Янка Купала.

Пяцербург. 18/х 12.

## З Беларусі і Літвы.

(*Ад уласных карэспандэнтоў*).

**Вільня.** У нас заўсёды: добрые пачаткі, а благі канец. Так і тутака. Гарадзкая Дума пастанавіла пабудаваць тымчасовы дом для работнікоў, што працуюць каля каналізацііі, каб тые мелі дзе сагрэцца ды пахарчэвацца. Убілі слупы, і пасьляні з мейсца. Трэба было-б Думе парупіцца хутчэй давясьці да канца гэту справу, бо зіма ўжо не за гарамі,—а тымчасам народ павінен мерзнуць ды траціць свaё здароўе.

= На Вострабрамскай вуліцы жылі два суседы—беларусы: Янук Міхалькевіч і Янук Вербель. 17 кастрычніка Міхалькевіч пайшоў на работу гарадзкой каналізацыі,—тады Вербель падгаварыў жонку яго забраць ад свайго мужыка падушкі, 2 пары ботаў і 30 рублей ды ўцячы. Паехалі німа ведама куды. Вербель таксама быў жэнаты: кінуў сваю жонку у Вільні. *С. Ж—йма.*

**Г. Горкі. Магілеўск. губ.**—У першы дзень кастрычніка адбыўся тут штогодні кірмаш. У гэтым гаду з'езд селян быў малы; і кірмаш выйшоў зусім дрэнны. Вінаваціць трэба пагоду. У нас ад пачатку месяца жніўня і аж да самага кастрычніка ішлі дажджы і было сьцюдзёна. Дарогі папсуваліся, і меж селян мала хто пацікавіўся паехаць на кірмаш. Дый таго, хто паехаў, турбацыя была дарэмна, бо ў самы кірмашовы дзень пайшоў дождж, зрабілася гразь,-дык які ўжо тут торг. Было навезена кадушэк, лык, каткоў, скрынь, рэшат і іншаго дрэвянага тавару, але шмат меней, чымся ў даўнейшые гады. Торг ішоў найбольш на коні. Якога-небудзь вёсковага гаспадарскага вырабленьня на продаж я нават і не бачыў. І ва усім вінавацяць селяне мокрае надворье, бо шмат яравога збожжа і сена пагніло на палёх, а лён, каторы пабралі, ды не пасьпелі да дажджа сабраць с поля, пачарнеў и выцек, а так-то зарадзіўся доўгі і ураджайны. Тольке і хваляцца селета людзі бульбай. Сьлівак у нас ў гэтым гаду не было, нават вясной шмат дрэў паўсохла, а яблак і дуль ураджай сярэдні, фрукты дробные. З гэтакіх прычын і кірмаш быў не завідны. Але-ж што-што, а гарэлку пілі на кірмашы, як усягды, калі ня лепей. Народ навакал жывець небагата, бо землі мала, а фабрычна - заводскаго промыслу ці якого іншаго німа і да жялезнаго шляку далёка, а гарэлкі пьець тутэйшы селянін надта многа. Страшеннае пьянства і сярод гарадзкіх земляробоў. Не дарма ж у горэцкіх сельск.-гаспадар. вучылішчах вучнёў горэцкаго і бліжэйшаго Чаўскаго павету, к нявыгодзе саміх жэ селян, на жаль мала. Селяне жаляцца, што грошы на навучаньне неаткуль узяць. Агулам кажучы, шырокае поле дзеля працы ёсць тут сеўбітам прасьветы сярод цёмнаго беларускаго селянства. Ды не якім-небудзь, а сьведомым сеўбітам—беларусам, што выйшлі з вёскі, знаюць яе і не адракліся роднай вёскі. Ато ў Горках здаўна ёсць шмат казённых «кулътуртргероў», бо калісь тут быў інстітут, а цяпер три сярэдніх вучылішчы для адукацыі на гаспадарцы, есць і казенная гаспадарка, ўсё гэта мае мэту, паміж іншаго, і шырыць культуру сярод акружных гаспадароў. І ня гледзячы на гэта „культура“ нешта далей Горак ў нашых мейсцах ня йдзе. На кожным кроку на кірмашы можна было спаткаць пьянаватаго, у беднай адзежы селяніна-беларуса. На маркотные думкі аб будучыне нашага краю наводзяць гэтакіе абычаі. Былі на кірмашы і кепскіе здарэньня, колькі сваркі, брудных слоў. Адно здарэньне апаведаю. Тутэйшы гарадзкі паліцэйскі, надзірацель атрымаў ў горадзі кепскую славу чэлавека, у катораго хапае сумленьня забраць грамадзяніна ў участак і здзекавацца там над ім. Нават ёсць на яго скарга ў судзе, што ён да крыві пабіў твар аднаму сельскаму гаспадару, пазваўшы таго ў канцэлярію запісаць за шыбкую язду ў горадзе. Цяпер гэты надзірацель хацеў забраць за нешта нейкага маладога хлапца на рынку. Той стаў спрэчацца і, вырываючыся ад паліцэйскіх, зьбіў шапку з галавы надзірацеля. Хлапца забралі ў паліцію, а назаўтра ураньні выпусьцілі с пабітаю галавою. Надзірацель гаварыў, што голаву хлапцу пабілі ў драцы селяне.

= 11 кастрычніка ў тутэйшых вучылішчах святкавалі сталетні юбілей таго часу, як французоў прагналі з Масквы. Была абедня і паніхіда, увечеры чытаньне аб вайне 1812 года. Вучням раздавалі пад распіску аб палучэньні кніжкі пра гэту вайну. Кніжкі выданьня вaенна - гістарычнай суполкі давалі дарма. *Беларус.*

**Шамоўская волосць, Мсціслаўск. пав. Магілеўс. губ.**—Тут быў вось які прыпадак. Селянін гэтай воласці Максім Міхасёў аддаваў грошы, што пазычаў ў валасной пазычков. кассе. Грошы ён гярнуць вярнуў, а запісаць гэта ў воласці чагось не парупіліся, бо пісар і старшыня, як казаў сам М. Міх., некуды рухтуваліся ісці з воласці, палуднаваць ці што, і сказалі яму, штоб ён ішоу у двор, а запісаць абецаліся апасьля. Селянін пайшоў. Але цраз тыдні два, а мо і болей, шлюць яму павестку, каб ён плаціў ў кассу грошы (тые што ён ўжо к тэрміну вярнуў), а не то будуць прадаваць с торгу яго скарб. Мак. Міх. перепалохаеся. Кінуў працу і ў будзённы дзень зара пабег ў воласьц. Челавек ён бедны і сумленны, дык хацеў распытацца аб гэтой павестцы і дабіцца толку. Добра што у селяніна былі сьведчыкі яны бачылі, як М. Міх. плаціў грошы. Валасные не адракліся своей абмылкі і ўжо не пыталі у селяніна грошы. А ўсе ён страціў рабочы дзень, набіуногі (хадзіць трэба было за 8 верст) і набрасяў клопату. Страціў бы можэ і грошы, каб ня меўся, калі што, прасіць земскаго зьявіць увагу на гэту дрэнню справу. І то балазе!

= У нашай воласці пьянство ўсё расцець. Цяпер ўжо не адны мястэчковые жыды здержаць тайна гарэлку (гэта вядзецца у нас спрадвеку) а пачынаюць нават і селяне каторые бядней, держаць на вэсках гарэлку. Усё гэта губіць вёскў. Старыкі трацяць здароеў і апошніе грошы на гарэлке, а маладзеж яшчэ і на гульню ў карты. І німа надзеі, што згінэць гэта хмара, бо мала цікавяцца нашы селяне лекарствам ад пьянства—школай і кніжкай. *Храсьнік.*

**В. Фесеўка.** Магіл. губ. Горэцк. пав. У цыгана Н. 14 акцября вечэрам кабета запаліўшы запалку стала нешта шукаць на тапчані, пад каторым было поўна лэну. Ад іскаркі лэн загарэўся. На гвалт кабеты збеглася семья. Замест таго каб гарэўшы лён затушыць пад тапчанамъ, яны павыцягівалі яго на хату, дзе ён захапіўся так, што нельга было нічога зробіць, як толькі ратаваць свае жываты. Сяліба сгарэла, жывэлу выгналі. Што справіліся выхапіць с хаты, у тлуму нехта пакраў.

Благі цяпер пайшоў народ: не памагаюць у бядзе чэлавеку але больш разарасць!

= Падняўся мароз; на грудзі, як на каменьню, тарахтаць кола, мейсцамі стаў Днепр. Сьнегу німа. *Сайка К[illegible]валь.*

## З усіх старон.

**Здароўе Насьледніка Цэсарэвіча.**

Здароуе Яго Высочэства Насьледніка Цэсарэвіча палепшаецца. Апошні бюльлетэнь такі:

Яго Высочэства Насьледнік Цэсарэвіч праз цэлы дзень быў вясёлы. Колер твары палепшаецца. Темпэратура раніцай 36,9, у дзень 36,8, вечэрам 37,4. Пульс раніцай 104, вечэрам 108.

Падпісалі лейб-пэдіатр Раухфус, лейб-мэдык Е. Боткін, гоноровы лейб-мэдык С. Острогорскій.

**Новая школа.**

Міністэр народнай асьветы паведаміў папечыцеля віленскаго школьнаго округа, каб у Барысаві Мінск. губ. аткрыць жаночую учыцельскую сэмінарыю.

**Суд над матросамі.**

У Сэвастопалі судзілі пяцёх матросоў. Стоючы на варце у турме, яны адмовіліся выдаць двох матросоў, арэштаваных на параходзе «Златауст», каб выпоўніць на іх сьмертны прысуд. Двох засудзілі на пяць гадоў у катаргу, аднаго на чатыры гады, двох апраўдалі.

= Двох матросоў, абвінавачэных за падбіваньне тавáрышоў нарушыць ваенную дысцыпліну, засудзілі на ссылку

**Лёс депутата.**

**У Мінусінску** памёр дэпутат 2 Думы ад Чэрнігоўскай губэрніі, В. Хвост.

Пасля сьмерці асталася жонка з 5 бязлетнімі дзяцьмі. Галадаюць, бо ня маюць нічога.

**Гібель экспэдыціі Седова.**

Матросы парахода „Опыт“, што прыйшоу з Норвэгіі, кажуць аб гібелі экспэдыцыі лейтэнанта Седова, каторы маніўся аткрыць поўночны полюс. Кажуць, што карабель зацерла лёдам. Выратавалася толькі некольке чэлавек.

**Змаганьне з гарэлкай.**

Сувалкскі губэрнатар зацвярдзіў прыгаворы сельскіх сходоў у вёсках Любаве і Людвінаве, павэдлуг каторых прадажа гарэлкі у дні сьвяточные забаронена ня толькі ў карчмах, але і у манапольках.

**Выбар прэзыдента Амэрыканскіх Злучэных Штатоў.**

У прэзыдэнты выбраны Вудро Вільсон.

Рэдактар-Выдавец
А. Уласоу.

Вучоны садовод Ю. Паўловіч аткрывае 12 лістапада (ноябра) у горадзі Вільні курсы садоводзтва і пчэлярства. Чытаць лекціі будуць:

**«Аб агародніцтве і садоводзтве»**
п. Ю. Паўловіч.

**«Аб жыцьці расьлін і глебазнаустве»** Вучыцель камэрчэскай школы
п. З. Грыневіч.

**«Аб фруктовых вінах»**
інжэнер п. Баршчэўскі.

**«Аб біопсыхологіі расьлін»**
доктар п. Краінскі.

Курсы будуць да Каляд кожны дзень ад 5 гадзіны да 8-й вечэрам. Па сканчэньню курсоў вучэнікам будуць выдаваць атэстаты. Аб варунках паступленьня даведацца можна у канторы Ю. Паўловіча: Вільня, Ботанічная вуліца, дом № 1.

W tych dniach wyjdzie z druku
jednodniówka humorystyczna pod tytułem
„KUKURYKU“
Żądajcie wszędzie! cena 10 kop.